# Рецензии

**Скарбы прыроды Беларусі: тэрыторыі, якія маюць міжнароднае значэнне для захавання біялагічнай разнастайнасці** / А.В. Казулін, Л.А. Вяргейчык, М.Я. Нікіфарау і інш. Мн.: Беларусь, 2002. 160 с.

У апошнія гады Рэспубліка Беларусь усё больш дзейсна і рэзультатыуна удзельнічае у рэалізацыі многіх міжнародных дамоуленасцей і пагадненняу у галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання прыроднага асяроддзя. Аб гэтым сведчыць той факт, што толькі за час свайго незалежнага развіцця наша краіна далучылася да 13 міжнародных прыродаахоуных канвенцый і узяла на сябе абавязацельствы перад сусветнай супольнасцю па іх выкананню. Асабліва значнае месца сярод гэтых актау мае Рамсарская канвенцыя аб водна-балотных угоддзях.

Як вядома, на тэрыторыі Беларусі захавалася у натуральным стане значная колькасць нізінных, пераходных і верхавых балот, азёр, рознай ступені пераувільготненых экасістэм, мноства забалочаных далін і пойм рэк. Усе яны выконваюць важную экалагічную функцыю захавання біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці. Улічваючы іх не толькі рэгіянальнае, але і агульнаеурапейскае і сусветнае значэнне, з 1996 г. вучоныя інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі у творчым супрацоуніцтве з вучонымі другіх навуковых і вучэбных арганізацый рэспублікі, у тым ліку і БДУ, выконваюць спецыяльную міжнародную праграму па інвентарызацыі, ацэнцы экалагічнага стану забалочаных і балотных тэрыторый, якія з'уляюцца месцамі канцэнтрацыі птушак у перыяд гнездавання, зімовак альбо міграцыі. Нягледзячы на даволі вузкую мэтавую функцыю гэтага праекта, навуковыя даследаванні тычыліся шырокага копа сучасных напрамкау вывучэння экалагічных праблем такіх тэрыторый, узнікшых у выніку наступствау гаспадарчай дзейнасці чалавека. Акрамя таго, распрацоувауся дэталёвы план кіравання і вылучаліся крытэрыі, па якіх вызначаецца міжнародны альбо нацыянальны статус "тэрыторый, важных для птушак" (ТВП) з адпаведнай сістэмай аховы.

Паспяховае выкананне задач у межах праекта было магчыма дзякуючы кансультацыйнай і фінансавай дапамозе Міністэрства прыродных рэсурсау і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Фонду Міхаэля Отта па ахове навакольнага асяроддзя (Германія), Каралеускага таварыства аховы птушак (Вялікабрытанія), Прадстауніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь.

Вынікам паспяховай шматгадовай працы па рэалізацыі Рамсарскай канвенцыі у нашай краіне з'уляецца кніга калектыву аутарау "Скарбы прыроды Беларусі: тэрыторыі, якія маюць міжнароднае значэнне для захавання біялагічнай разнастайнасці". Яе змест уключае падрабязную характарыстыку геаграфічнага становішча, батанічных, гідралагічных і арніталагічных асаблівасцей 24 прыродных водна-балотных аб'ектау, якія адпавядаюць патрабаванням і могуць быць уключаны у спіс Рамсарскіх тэрыторый. Кніга выдадзена на беларускай і англійскай мовах, што дае магчымасць пазнаёміцца з ёю замежным спецыялістам і усім тым, хто мае прафесійны інтарэс і дачыненне да праблем аховы навакольнага асяроддзя і захавання прыроднай спадчыны.

Адной з найбольш адметных асаблівасцей выдання з'яуляецца мноства (каля 400) каляровых ілюстрацый: выразных фотаздымкау балотных, азёрных, рачных і лясных краявідау Беларусі, агульнавядомых, а таксама рэдкіх і знікаючых відау дзікіх жывёл і птушак. Яны не толькі удала дапауняюць, але значна узбагачаюць змест кнігі, робяць яе больш цікавай для чытачоу, у першую чаргу для аматарау вывучэння і аховы прыроды нашай краіны.

Як вядома, вылучэнне Рамсарскіх тэрыторый і прыданне ім прыродаахоунага статуса ажыццяуляецца на выснове спецыяльна распрацаваных і афіцыйна зацверджаных крытэрыяу, якія дазваляюць аднесці водна-балотныя угоддзі да міжнароднай (група А), нацыянальнай альбо рэгіянальнай (група Б) знач-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

насці. Як правіла, тэрыторыі міжнароднай значнасці спалучаюць высокую ступень захавання экасістэм у натуральным стане на вялікай плошчы і "на іх штогодна гняздуюцца, зімуюць альбо спыняюцца падчас міграцыі значная колькасць відаў, якія знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення" (с. 10). У Беларусі да Рамсарскіх угоддзяў такога узроўню адносіцца Бярэзінскі біясферны запаведнік, Нацыянальны парк "Белавежская пушча", балота "Спораўскае", ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння "Сярэдняя Прыпяць", лесабалотны комплекс "Альманскія балоты". На іх тэрыторыі канцэнтруецца 6 відаў птушак, якія знаходзяцца пад пагрозай глабальнага знікнення (белавекі нырок, арлан-белахвост, вялікі арлец, драч, дубальт, вяртлявая чаротаўка). Усяго ж у розных групах Рамсарскіх угоддзяў нашай краіны у цяперашні час абітае 33 віды рэдкіх і знікаючых птушак.

Трэба зазначыць, што уключэнне воднабалотных угоддзяў у спіс Рамсарскіх тэрыторый дазваляе ахоўваюць не толькі птушак, але біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, падтрымліваць асяроддзефарміруючую ролю такіх угоддзяў у рэгіёне. Цяпер у склад Рамсарскіх тэрыторый уваходзяць 11 асабліва ахоўваемых прыродных аб'ектаў, 4 – ахоўваюцца часткова і 9 тэрыторый не маюць ахоўнага статуса.

У кнізе прыведзена кароткая, але змястоўная і усебаковая характарыстыка кожнага з такіх аб'ектаў, якая уключае геаграфічнае і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае іх месцазнаходжанне, агульную плошчу, нацыянальны і міжнародны статус аховы, апісанне найбольш распаўсюджаных прыродных экасістэм і іх сучасны стан. Гэтыя звесткі дапаўняюцца прыведзенай тапаграфічнай картайсхемай аб'екта. Для тых прыродных аб'ектаў, якія уключаны у лік Рамсарскіх угоддзяў, дадаткова аналізуюцца фактары, якія адмоўна уплываюць на экалагічны стан асяроддзя. Даецца аналіз магчымых мерапрыемстваў, напраўленых на іх стабілізацыю і ахову.

На нашу думку, знаёмства са зместам кнігі, багатым ілюстрацыйным матэрыялам выклікае у кожнага чытача замілаванасць прыгажосцю краявідаў і разнастайнасцю жывёльнага свету Беларусі.

Рэцэнзуемая кніга з'яўляецца прыкладам высокапрафесійнага падыходу да усебаковага асвятлення праблем захавання прыроднай спадчыны. Таму яна, мяркуецца, будзе добрым дапаможнікам не толькі выкладчыкам, навуковым супрацоўнікам, студэнтам, але і аматарам прыроды, экскурсаводам, турыстам, усім, хто неабыякава ставіцца да лёсу прыроды роднай Беларусі.

***В.М. Яцухна***

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm